# На 118 мільёнаў руб. звыш плана дасць тавараў шырокага спажывання прамысловасць Беларусі

Бюро ЦК КП(б) Беларусі з удзелам усіх наркаматаў і трэстаў абмеркавала магчымасці дадатковага выпуску прадметаў шырокага спажывання і іншых тавараў прамысловасцю БССР у 1936 годзе. Пры першым падліку выяўлена магчымасць выпусціць дадаткова прадукцыі не менш чым на 118 мільёнаў рублёў, у тым ліку па прадпрыемствах Наркаммясцпрома і Промкаапераныі не менш 70 мільёнаў рублёў і па прадпрыемствах саюзнай прамысловасці, размешчаных на тэрыторыі БССР, не менш чым на 45 мільёнаў рублёў.

Бюро ЦК КП(б)Б вылучыла камісію ЦК для распрацоўкі ўсіх неабходных практычных мерапрыемстваў у мэтах выканання данага рашэння і выяўлення дадатковых магчымасцей вытворчасці тавараў шырокага спажывання па ўсіх сістэмах, у тым ліку мясцовай прамысловасці райвыканкомаўскага падпарадкавання. Мы не сумняваемся, што канчатковая сума магчымай і дадатковай вытворчасці шырспажыву будзе значна большай.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы